***Шылава А. С.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі;*
***Мурашка Н. У.***, *магістрант.*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

# Фальклор як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў у пазакласнай дзейнасці

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы. Гэта звязана з мадэрнізацыяй адукацыйнага працэсу I ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

*Кампетэнтнасны падыход* у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў пра мову развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя гэтага падыходу прадугледжвае фарміраванне ў вучняў шэрагу кампетэнцый. Кампетэнцыі ў моўнай адукацыі адлюстроўваюць здольнасць рэалізацыі моўных ведаў і ўменняў праз маўленчую дзейнасць у розных сітуацыях зносін, у тым ліку ў працэсе навучання [1, с. 3].

Згодна с вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя* з'яўляецца часткай кампетэнтнаснага падыходу пры навучанні мове і ўключае:

- валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці;
- фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін;
- уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі [1, с. 4].

У сваю чаргу А. А. Быстрова адзначае, што маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя складаецца з ведаў аб мовазнаўчых паняццях і камунікатыўных уменнях [2].

Камунікатыўныя ўменні — гэта сукупнасць простых уменняў, такіх як уменне вусна і пісьмова перадаваць інфармацыю, уменне прымаць інфармацыю з патрэбным сэнсам, уменне слухаць, уменне разумець іншага, якія неабходны дзіцяці для зносін, навучання, узаемадзеяння ў калектыве, а таксама развіцця асобы.

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшым школьным узросце найбольш проста праходзіць у працэсе сюжэтна-ролевай гульні як найбольш дакладнай і даступнай мадэлі зносін. Сродкамі для развіцця камунікатыўных уменняў як часткі маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, а таксама маўлення ў малодшых школьнікаў сучасныя даследчыкі лічаць гульнёвыя практыкаванні, сюжэтна-ролевыя гульні. У час гульнёвай дзейнасці вучні аб'ядноўваюцца ў гульнёвыя калектывы, пераймаюць адзін у аднаго існуючыя веды. Неабходнасць весці размову з аднагодкамі стымулюе развіццё звязнага маўлення, асабліва дыялагічнага. Дыялог як найбольш натуральная форма маўленчай дзейнасці прадугледжвае наяўнасць пастаяннай зваротнай сувязі, падмацавання з боку партнёра. Педагог, арганізуючы гульню, кіруе працэсам зносін паміж вучнямі і стымулюе іх маўленчыя зносіны. Значыць, гульня альбо гульнёвая дзейнасць могуць служыць як сродкам развіцця камунікатыўных уменняў, так і індыкатарам узроўню развіцця зносін і маўлення. Такім чынам, працу па асваенні маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў пажадана праводзіць у займальнай форме, пашыраць кругагляд вучняў, выхоўваць у іх высокія маральныя якасці.

Новыя даследаванні ў галіне псіхалогіі і педагогікі ў якасці сродкаў фарміравання камунікатыўных уменняў у вучняў называюць народную цацку, казкі, легенды, што, у сваю чаргу, з'яўляецца часткай фальклору. Гэта дае нам падставу звярнуць увагу на фальклор як на сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Сучасная навука не дае адзінай трактоўкі паняцця «фальклор». Часам яно ўжываецца ў першапачатковым значэнні, а часам выкарыстоўваецца і ў больш вузкім, больш канкрэтным значэнні: вусная народная творчасць. У нашым даследаванні

мы будзем ужываць паняцце «фальклор» у больш шырокім значэнні, таму што фальклор — гэта не толькі народная творчасць, гэта яшчэ і светапогляд народа, і сістэма каштоўнасцей, і сістэма выхавання маладога пакалення. Пацверджаннем гэтага служыць наяўнасць такіх галін педагогікі, як народная педагогіка і этнапедагогіка. Народная педагогіка ўключае ў сябе існуючыя ў народзе выхаваўчыя ідэі, традыцыі, вопыт выхаваўчай практыкі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне; этнапедагогіка бярэ факты ў народнай педагогіцы, а тэарэтычны інструментарый — у агульнай педагогіцы.

Каштоўнасць фальклору як педагагічнага сродку вызначаецца:

- натуральным, беспрымусовым уздзеяннем на дзяцей дзякуючы сродкам выразнасці;
- даступнасцю для дзяцей з розным узроўнем развіцця;
- стымуляваннем развіцця творчых здольнасцей асобы.

Акрамя таго, у фальклорнай традыцыі няма падзелу на выканаўцаў і гледачоў таго ці іншага акта творчасці, а ўсе прысутныя з'яўляюцца яго ўдзельнікамі і стваральнікамі. Гэты працэс з'яўляецца вельмі істотным, паколькі здымаецца механізм ацэньвання, дзіця адчувае сябе вальней і сам працэс яго ўдзелу ў песні, танцы, гульні надзяляецца сэнсам.

Беларускі фальклор вельмі багаты і разнастайны. Ён прадстаўлены традыцыямі і звычаямі, гульнямі, песнямі, танцамі, вуснай народнай творчасцю. Увесь гэты матэрыял нясе ў сабе велізарны патэнцыял для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў. Разглядаючы гэта пытанне, нельга не закрануць педагагічны аспект. Усім вядома, што паспяховасць любога працэсу навучання залежыць ад выканання прынцыпаў навучання: нагляднасці, сістэмнасці і паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці вучняў, даступнасці, выхаваўчага і развіваючага характару, рацыянальнага спалучэння калектыўных і індывідуальных форм працы, уліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў, трываласці вынікаў, сувязі навучання з жыццём, навуковасці.

У педагагічным плане фальклорны матэрыял таксама дае нам вялікія магчымасці. Фальклор заўсёды меў сувязь з жыццём, ён выхоўвае і развівае, даступны і зразумелы для малодшых школьнікаў, а таксама нагляднасці. Пры вывучэнні фальклорных матэрыялаў, напрыклад, паводле «народнага календара» (восеньскі, зімовы, вясновы, летні цыклы) выконваецца прынцып сістэмнасці і паслядоўнасці. Фальклор дае нам магчымасць выбару форм працы: індывідуальнай, групавой, калектыўнай. Гульнёвая і творчая дзейнасць, якую прадугледжвае фальклорны матэрыял, дапамагае забяспечыць актыўнасць і свядомасць удзелу навучэнцаў у працэсе навучання, што абавязкова вядзе да трываласці вынікаў навучання.

У сучаснай школе на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі фальклорны матэрыял для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі магчыма выкарыстоўваць як у вучэбнай, так і ў пазавучэбнай дзейнасці.

Разгледзім магчымасці выкарыстання фальклору ў пазавучэбнай дзейнасці (табліца 1).

Табліца 1 — Магчымасці выкарыстання фальклору ў пазавучэбнай дзейнасці

| Від дзейнасці | Фальклорны матэрыял, які падыходзіць для дзейнасці |
|---|---|
| Гульнёвая | Гульні, гульні-танцы, гульні-песні |
| Пазнавальна-працоўная (вытворчая) | Святы і абрады, тэатр і батлейка, творы вуснай народнай творчасці |
| Дзейнасць, накіраваная на выхаванне праблемна-каштоўнасных адносін | Святы і абрады, тэатр і батлейка, творы вуснай народнай творчасці |
| Забаўляльная | Гульні, гульні-танцы, гульні-песні, святы і абрады (тэатралізацыя), батлейка, творы вуснай народнай творчасці (тэатралізацыя) |
| Выяўленча-мастацкая | Цацкі, святы і абрады, творы вуснай народнай творчасці |
| Спартыўна-аздараўленчая | Гульні, гульні-спаборніцтвы |

Больш падрабязна спынімся на ***святах*** і ***абрадах***. Народныя святы называюць скарбніцай нацыянальнай культуры, якія захоўваюць багацці шматвяковай даўнасці. У іх ёсць прыгажосць і паэзія, адпачынак і весялосць, легенды і паданні, і з кожным з іх звязаны свае абрады, звычаі і традыцыі.

Традыцыі — з'ява больш шырокая, чым звычаі. Традыцыі могуць выяўляцца ў розных сферах жыцця: грамадскай, духоўнай і г. д. Звычай разумеецца як стэрэатып паводзін, звыклы ў дадзеным грамадстве, стэрэатып, які пастаянна прайграецца. Таму абсалютна справядліва сцвярджаць, што традыцыі і звычаі валодалі асаблівай сілай выхаваўчага ўздзеяння ў сістэме народнай педагогікі. І звычаі, і традыцыі з'яўляліся сацыяльнымі механізмамі духоўнай пераемнасці пакаленняў. Многія з іх пражылі сотні пакаленняў. Даўгавечнасць, выключная ўстойлівасць і трываласць — вось спецыфічныя рысы, якія характэрны для народных традыцый.

У сучаснай школе звычаі і традыцыі як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў можна выкарыстоўваць у пазавучэбнай дзейнасці. Як правіла, праца настаўніка з народнымі традыцыямі і абрадамі можа ўяўляць сабой:

**1. *Разбор і абмеркаванне.*** Праца з абрадам заўсёды пачынаецца са знаёмства з ім, абмеркавання і аналізу яго значэння.

**2. *Распавед-паказ.*** Пазакласнае мерапрыемства для бацькоў, дзе дзеці разам з настаўнікам

аднаўляюць, расказваюць і паказваюць які-небудзь абрад.

**3. *Драматызацыя*.** Інсцэніроўка абрадаў або іх фрагментаў дапамагае развіваць маўленне і творчыя здольнасці дзяцей, развівае ўменне працаваць у групах, разам.

**4. *Творчая праца*.** Маляванне, падрыхтоўка праектаў самастойна або з бацькамі. Такая праца развівае вучня, усталёўвае сувязь мінулага з сучаснасцю, спрыяе ўзаемадзеянню з дарослымі і з аднагодкамі, аб'ядноўвае.

Разгледзім некаторыя з іх на канкрэтных прыкладах. Для гэтага спынімся на традыцыйным народным свяце Каляды. Наш выбар абумоўлены тым, што ў вучэбнай праграме па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» для IV класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання ў раздзеле «Геаграфічныя і гістарычныя звесткі аб нашай Радзіме» прадугледжана азнаямленне вучняў з традыцыйнымі народнымі святамі, такімі як Радаўніца, Купалле, Дзяды, Каляды [1, с. 115]. Зразумела, што сфарміраваць трывалыя веды вучняў аб гэтых святах на адным уроку немагчыма. Мы прапануем выкарыстоўць гэтыя святы ў якасці сродку фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў пазавучэбнай дзейнасці ў ***папярэдніх класах,*** выкарыстоўваючы метад апераджальнага навучання, тады ў IV класе на вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» вучні будуць самі расказваць аб іх, абапіраючыся ўжо на свае сфарміраваныя веды.

Так, напрыклад, ***разбор і абмеркаванне*** па тэме «Каляды» мэтазгодна правесці ў II класе ў цыкле тэматычных класных гадзін, прымеркаваных да гэтага свята.

## Тэматычная класная гадзіна «Прыйшла Каляда!»

***Мэта:*** пазнаёміць вучняў з традыцыйным народным святам Каляды.

***Задачы:***

- пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- ствараць умовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне і матэрыялы:*** мультымедыйная прэзентацыя; раздатачны матэрыял для групавой працы: карткі з выявамі мёду, арэхаў, скваракі, ячневай кашы, вады, масла, маку, яблык; буклет для вучняў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Падрыхтоўка вучняў да ўспрымання матэрыялу.**

***Настаўнік (Н.):*** Сёння мы з вамі пагаворым аб традыцыйным народным свяце Каляды. Ці ведаеце вы, што такое Каляды?

***Вучань (В.):*** Свята!

***В.:*** Калі прыходзяць дамоў і просяць цукеркі!

***Н.:*** Малайцы! Вы так шмат ведаеце! Як перакласці слова *каляды* з беларускай мовы?

*У адказах вучняў могуць быць недакладнасці альбо яны могуць не адказаць на гэтае пытанне, але часцей за ўсё дзеці перакладаюць каляды як «рождество».*

***Н.:*** Якія вы малайцы, правільна адказалі на пытанні, але сёння мы больш падрабязна ўсе разам пазнаёмімся з гэтым вясёлым і ўсімі любімым святам.

**3. Знаёмства вучняў з традыцыйным народным святам Каляды.**

*Расповед настаўніка з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі.*

— Каляды — адно з самых містычных святаў. Першы дзень Калядаў — дзень пасля зімовага сонцастаяння — звычайна прыходзіўся на 23–24 снежня па сучасным стылі. На Каляды «нараджалася новае сонца», час «паварочваўся на вясну».

Да Каляд абавязкова адказна рыхтаваліся, прыбіралі хату, убіралі яе самаробнымі ўпрыгажэннямі.

Каляды — свята вясёлае. На Каляды нельга было рабіць ніякую працу, можна было толькі весяліцца, каб падтрымаць сілы святла сваім настроем ды задорам.

Працягваліся Каляды прыкладна два тыдні, да 6–7 студзеня. Асаблівае месца ў святкаванні Каляд адводзілася святочным стравам. Нашы продкі верылі, што калі зрабіць багаты «стол», то на наступны год будзе добры ўраджай і здароўе. У кожнай, нават самай беднай хаце, на Каляды даставалі са схованак мяса ды каўбасы, сала, арэхі, яблыкі, мёд. Галоўная страва Калядаў — ***куцця.***

На Каляды было прынята збірацца разам, усёй сям'ёй. На працягу калядных тыдняў быў звычай хадзіць у госці да родных і сяброў.

Па хатах хадзілі калядоўшчыкі. Гэта пераапранутая моладзь. Гаспадары частавалі іх. Часцей за ўсё гэта былі арэхі, пернікі і печыва, пазней — цукеркі.

Яшчэ на Каляды абавязкова варажылі (прадказвалі будучыню). Кідалі на дарогу чаравікі, пыталіся пра імёны, лілі воск у сцюдзёную ваду.

Пазней Каляды аб'ядналі з рэлігійным святам Раства Хрыстова і крыху змянілі на царкоўны лад. Але магічны сэнс свята, багаты стол, падарункі, паходы ў госці адзін да аднаго, маскарад так і засталіся з намі па сённяшні дзень [3].

***Н.:*** Вы так уважліва слухалі мяне, а зараз адкажыце на мае пытанні:

— Як рыхтаваліся да Каляд?

— Колькі тыдняў яны працягваліся? А тыдзень — гэта колькі дзён?

— Што рабілі на Каляды?

— Як называлася галоўная калядная страва?

— Вы такія малайцы! Вы столькі сёння даведаліся і мне расказалі. А зараз я прапаную вам прыгатаваць куццю. Для гэтага мы падзелімся на тры групы па радах. Кожная група атрымае канверт з заданнем. У канверце вы знойдзеце тэкст

з апісаннем «сваёй» куцці і набор малюнкаў з выявамі прадуктаў. Вам трэба прачытаць тэкст, выбраць патрэбныя прадукты і падрыхтаваць расказ для класа пра «сваю» куццю.

**4. Праца ў групах.**

Дзеці атрымліваюць заданне ў канвертах. У кожным канверце тэкст з апісаннем адной куцці і аднолькавы для ўсіх груп набор малюнкаў з выявамі мёду, арэхаў, скварак, ячневай кашы, вады, масла, маку (гл. эл. дадатак).

1. Першая куцця «посная» — ячневая каша з мёдам ці макам. Ладзілася ў першы дзень Каляд.

2. Другая куцця «багатая» — ячневая каша са скваркамі і маслам. Ладзілася праз тыдзень. Супадала з Новым годам.

3. Трэцяя куцця «вадзяная» — ячневая каша. Ладзілася ў апошні дзень Каляд.

На выкананне задання дзецям адводзіцца каля 5–10 хвілін.

**5. Прадстаўленне.**

Важна паведаміць дзецям, што яны павінны расказаць:

- калі рыхтавалася «іх» куцця;
- назваць і паказаць прадукты, з якіх яна гатавалася.

Вучні рыхтуюцца, пасля чаго кожная група выходзіць і прадстаўляе «сваю» куццю.

Пасля таго як група выступіла, важна паказаць дзецям на слайдзе правільны варыянт адказу, каб яны самі ацанілі сваё прадстаўленне. Акрамя таго, для замацавання ўмення правільна і прыгожа гаварыць мэтазгодна правесці працу ў парах. Выглядае гэта наступным чынам:

Першая група расказвае падрыхтаваны тэкст пра «посную» куццю: «Куцця мела назву "посная". ***Яё*** рабілі ў першы дзень. Гэта каша ***с*** мёдам ***ілі*** макам».

***Н.:*** Малайцы! Давайце паглядзім правільны адказ. (Адкрывае слайд з правільным адказам і просіць аднаго з вучняў прачытаць тое, што напісана на слайдзе.) Ці ўсё правільна і прыгожа вы нам расказалі? *(Не зусім.)*

— Тады давайце знойдзем памылкі ў адказе.

Вучні шукаюць памылкі, пасля чаго настаўнік прапануе ім яшчэ раз прачытаць гэты тэкст у парах.

— Цяпер працуем у парах. Вучні, якія сядзяць на першым варыянце, чытаюць услых яшчэ раз гэты тэкст, а вучні, якія сядзяць на другім варыянце, правяраюць, ці правільна ён прачытаны. Затым вучні, якія сядзяць на другім варыянце, расказваюць яго, а вучні, якія сядзяць на першым варыянце, правяраюць.

Пасля гэтага прадстаўляць свой расказ выходзіць другая група. Праца з другой і трэцяй групай праводзіцца па аналогіі з першай.

**6. Падвядзенне вынікаў.**

***Н.:*** Пра якое традыцыйнае народнае свята мы сёння вялі размову?

— Пра што незвычайнае ці новае вы сёння даведаліся?

— Каб вы лепш запомнілі пра Каляды і змаглі цікава расказаць сваім бацькам і сябрам, кожнаму з вас я падару буклет.

**7. Рэфлексія.**

Настаўнік прапануе дзецям адказаць на наступныя пытанні:

- Ці спадабалася вам працаваць у групах?
- Якія цяжкасці вы адчувалі, калі працавалі разам?
- Што вам спадабалася на класнай гадзіне больш за ўсё?
- Хто хоча ўдзельнічаць у падрыхтоўцы наступнай класнай гадзіны?

Для жадаючых паўдзельнічаць у наступнай класнай гадзіне можна раздаць тэксты для падрыхтоўкі пераказу:

1. Калядаванне — адна з самых яркіх традыцый, якая дайшла да нас. Моладзь збіралася разам, пераапраналася ў жывёл (мядзведзя, карову, казу, каня, бусла) і хадзіла па хатах.

2. Яны спявалі калядныя песні, жадалі ўсяго лепшага,ігралі на музычных інструментах. Называлі іх калядоўшчыкамі.

3. Часцей за ўсё калядоўшчыкі прыходзілі з «казой». Каза скакала пад песні, «калола» прысутных рагамі, а ў канцы песні падала і «памірала».

4. Гаспадары давалі ў падзяку «казе» розныя прысмакі, каб каза «ўстала». Часцей за ўсё гэта былі арэхі, пернікі і печыва, цукеркі.

5. Адмовіць калядоўшчыкам у пачастунках азначала наклікаць на сябе няміласць, пазбавіць поспеху на ўвесь наступны год.

6. З поўнымі мяшкамі пачастункаў калядоўшчыкі збіраліся ў адным месцы, з'ядалі падарункі, пелі песні ды вадзілі карагоды.

7. Ад той пары і да сённяшняга захаваўся звычай ладзіць маскарад на Новы год, абменьвацца падарункамі, вадзіць карагоды.

8. Так заканчвалася самае вясёлае і самае любімае нашымі продкамі свята.

## Тэматычная класная гадзіна «Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!»

***Мэта:*** пазнаёміць вучняў з традыцыяй калядавання.

***Задачы:***

- пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- ствараць умовы для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне і матэрыялы:*** мяшок, кажух ці футравая шапка, цукеркі;

раздатачны матэрыял, ноты і тэкст песні «Го-го-го, каза...», маска «Казы», калядная зорка, буклет для вучняў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Падрыхтоўка вучняў да ўспрымання матэрыялу.**

— Давайце ўспомнім, пра што мы гаварылі на мінулай класнай гадзіне. *(Пра Каляды.)*

— Малайцы! А што вы можаце ўспомніць пра гэта свята? *(Прыбіралі хату, упрыгожвалі. Каляды працягваліся два тыдні. Усе збіраліся разам, усёй сям'ёй. Па хатах хадзілі калядоўшчыкі. На Каляды варажылі. Хадзілі ў госці да родных і сяброў. Гатавалі куццю.)*

— Малайцы, усё ўспомнілі. Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з абрадам калядавання. А дапамогуць нам у гэтым вучні, якія падрыхтавалі дома расказ пра яго.

**3. Знаёмства вучняў з абрадам калядавання.**

*Расказ вучняў* (суправаджаецца паказам мультымедыйнай прэзентацыі «Добры вечар таму, хто ў гэтым даму!»).

— Выдатны расказ. Мне вельмі спадабалася, як вы падрыхтаваліся! Я хацела б падзякаваць за дапамогу цукеркамі. (Зварот да класа.) А вам спадабалася?

— Вы так уважліва слухалі, а зараз у мяне для вас заданне. Пагуляем у знатакоў. У мяне ёсць тры пакеты з рэчамі, якія былі ў калядоўшчыкаў. Кожнаму раду я раздам па адным пакеце. Ваша задача — за 5 хвілін здагадацца, для чаго гэтыя рэчы ім былі патрэбны, і расказаць нам аб гэтым.

Настаўнік раздае пакеты з рэчамі:

- У першым пакеце — мяшок з тканіны (для падарункаў).
- У другім пакеце — маска казы (для пераапранання ў Казу).
- У трэцім пакеце — кажух ці футравая шапка (для пераапранання ў Казу).

**4. Гульня ў знатакоў.**

Вучні выказваюць свае меркаванні, для чаго калядоўшчыкам патрэбны гэтыя рэчы. Дзеці могуць не адгадаць іх прызначэнне, але ў любой сітуацыі настаўнік павінен падтрымаць вучняў і даць правільны адказ.

У канцы гульні настаўнік прапануе пераапрануць аднаго з вучняў у галоўны сімвал Каляд — Казу.

— Малайцы! Вы добра папрацавалі, але ў мяне ёсць яшчэ адна рэч.

Настаўнік паказвае калядную зорку.

— Вы ведаеце, што гэта такое? І для чаго яна патрэбна была?

— Зімой вельмі доўгія і цёмныя ночы. У марозную ноч на небе заўсёды відаць шмат зорак, але адна з іх свеціць асабліва ярка. Яе называлі пуцяводнай зоркай. Пуцяводная зорка асвятляла дарогу людзям. Калядоўшчыкі таксама насілі з сабой сваю пуцяводную зорку — калядную зорку. Яна «асвятляла ім дарогу» і прыносіла ў дом людзям дабрабыт.

**5. Праца ў парах.**

— Мы з вамі добра папрацавалі, даведаліся пра традыцыйнае беларускае свята Каляды, пра тое, хто такія калядоўшчыкі. Цяпер я прапаную вам папрацаваць у групах і разгадаць красворд. Вучні, якія сядзяць на першым варыянце, адгадваюць пытанні 1, 3, 5. Вучні, якія сядзяць на другім варыянце, адгадваюць пытанні 2, 4, 6. Затым правяраем адзін у аднаго, ці правільна разгадана.

1. Як называлася жывёла, з якой звычайна хадзілі калядоўшчыкі?
2. Колькі тыдняў працягваліся Каляды?
3. Як называлі моладзь, якая хадзіла па хатах?
4. Як называлася галоўная калядная страва?
5. Што давалі гаспадары калядоўшчыкам?
6. Як называліся танцы, якія выконвалі на Каляды?

| | |
|---|---|
| 1 | К А З А |
| 2 | Д В А |
| 3 | К А Л Я Д О Ў Ш Ч Ы К І |
| 4 | К У Ц Ц Я |
| 5 | П А Д А Р У Н К І |
| 6 | К А Р А Г О Д Ы |

**6. Падвядзенне вынікаў.**

— Красворд разгаданы. Якое галоўнае слова ў нас атрымалася? *(Каляды.)*

— Малайцы! За добрую працу трымайце цукеркі!

**7. Рэфлексія.**

Настаўнік прапануе дзецям адказаць на наступныя пытанні:

- Ці спадабалася вам распавядаць сваім сябрам пра калядоўшчыкаў?
- Якія цяжкасці вы адчувалі, калі працавалі разам?
- Што вам спадабалася на класнай гадзіне больш за ўсё?

На прыкладзе невялікага цыкла класных гадзін мы паказалі, як можна арганізаваць у II класе ***разбор і абмеркаванне*** традыцыйнага абраду. Такая праца актыўна развівае маўленне вучняў, павялічвае іх слоўнікавы запас. Дзеці вучацца ясна, лаканічна, выразна выказваць свае думкі, апісваць прадмет ці з'яву.

Для вучняў III класа мэтазгодна выкарыстоўваць такую форму пазакласнага мерапрыемства, як ***расповед-паказ*** для бацькоў, дзе дзеці разам з настаўнікам расказваюць пра Каляды і самастойна паказваюць абрад «***Калядаванне***».

Для арганізацыі такога мерапрыемства неабходна загадзя раздаць дзецям словы для завучвання на памяць і правесці некалькі рэпетыцый. Разгледзім прыклад такога паказу.

**Расповед-паказ па тэме «Прыйшлі Калядкі...»**

***Мэта:*** расказаць бацькам пра традыцыйнае народнае свята Каляды.

***Задачы:***

- развіваць маўленне і пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- пашыраць і паглыбляць уяўленні дзяцей аб традыцыйных беларускіх святах;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа.

***Абсталяванне і матэрыялы:*** касцюмы для каляднага гурта, цукеркі; мультымедыйная прэзентацыя, буклет для бацькоў.

Паказ пачынаецца з таго, што вучні заходзяць у клас і пачынаюць расказваць па чарзе свае тэксты пра свята Каляды. Неабходна адзначыць, што важна задзейнічаць у гэтым мерапрыемстве як мага больш вучняў. Расповед суправаджаецца паказам прэзентацыі «Прыйшлі Калядкі...» (гл. эл. дадатак).

***Вучань 1:*** У канцы снежня пасля пасля зімовага сонцастаяння нашы продкі святкавалі Каляды.

***Вучань 2:*** Звычайна Каляды працягваліся два тыдні.

***Вучань 3:*** Да Каляд абавязкова адказна рыхтаваліся. Прыбіралі хату, убіралі яе самаробнымі ўпрыгажэннямі.

***Вучань 4:*** На Каляды нельга было рабіць ніякую працу, можна было толькі весяліцца.

***Вучань 5:*** На Каляды нашы продкі рабілі багаты стол, каб на наступны год быў добры ўраджай і здароўе.

***Вучань 6:*** Галоўная страва Калядаў — куцця. Гэта ячневая каша з дабаўленнем мёду, арэхаў, скваракі.

***Вучань 7:*** На Каляды было прынята збірацца разам, усёй сям'ёй.

***Вучань 8:*** Моладзь збіралася разам, пераапраналася ў жывёл (мядзведзя, карову, казу, каня, бусла) і хадзіла па хатах, спяваючы калядныя песні з пажаданнямі ўсяго лепшага. Называлі іх калядоўшчыкамі.

***Вучань 9:*** Гаспадары, якіх яны наведвалі, давалі ў падзяку розныя прысмакі.Часцей за ўсё гэта былі арэхі, семкі, пернікі і печыва, сухафрукты, пазней — цукеркі.

***Вучань 10:*** Адмовіць калядоўшчыкам у пачастунках — наклікаць на сябе няміласць, пазбавіць сябе дабрабыту на ўвесь наступны год.

***Вучань 11:*** У наш час Каляды супадаюць са святам Раства Хрыстова, якое мы святкуем 7 студзеня.

***Вучань 12:*** Аднак магічны сэнс свята, багаты стол, падарункі, паходы ў госці адзін да аднаго, маскарад засталіся з намі па сённяшні дзень.

***Вучань 13:*** Ой, чуеце, што гэта за шум?

***Вучань 14:*** Відаць, калядоўшчыкі ідуць!

*Уваходзіць калядны гурт.*

**Калядны гурт:** Звяздар (той, хто нясе зорку); Завітальнік (павадыр Казы); Каза (пераапрануты ў кажух вучань з маскай Казы на галаве); Механоша (той, хто носіць з сабой мяшок з тканіны для падарункаў); Лекар; Хлопцы, дзяўчаты.

*Калядны гурт падыходзіць да парога класа, іграе музыка, Завітальнік выходзіць наперад.*

***Завітальнік:*** Добры вечар у хату! Добры вечар добрым людзям! Ці дазволіце маёй кампаніі разам з казой павіншаваць вас са святам, развесяліць усю грамаду?

*Пасля атрымання дазволу ўсе ўваходзяць.*

***Механоша:*** Добры вечар таму, хто ў гэтым даму! Сардэчна ўсіх вітаем і віншуем з Раствам Хрыстовым, Новым годам і зваротам сонейка на лета!

***Завітальнік з Механошам:*** Жадаем, пане гаспадару, на полі — капамі, на гумне — тарпамі, у таку — умалотам, у арудзе — спорам, у млыне — з прымолам, у дзяжы — з падыходам, у печы — з прыбыткам!

***Увесь гурт:*** З добрым ужыткам!

*Карагод «Го-го-го, каза, го-го-го, шэра» (Каза падае на падлогу).*

***Механоша:*** Каза шуткі прытварыла — абмахнулася, упала! Людзі добрыя, ці ёсць сярод вас лекар, каб Казу вылечыць? Ці змяя яе ўкусіла, ці чэмер прыстаў?

***Усе:*** Лекара, лекара!

***Лекар:*** Я — лекар! Галоўны аптэкар: кароў лячу, корпію ўстаўляю, людзей на той свет адпраўляю *(аглядае Казу)*. А што б каза-хворая пажадала, каб яна ўстала?

***Каза:*** Мэ — э-э-э! *(ляжыць)*.

***Лекар:*** Гаспадар, бліны на стол стаў, каб наш казёл устаў!

*Выпрошванні падарункаў (па чарзе):*

***Вучань 1:*** Дайце каўбасу, а то хату растрасу!

***Вучань 2:*** Пахадзі каля печкі, пашукай нам перапечкі!

***Вучань 3:*** Залезь, дзядзька, на драбінку ды адрэж нам саланінкі!

***Вучань 4:*** Дай нам сала, не скупіся, каб ячмень твой урадзіўся!

*Каза ўстае.*

**Завітальнік** *(атрымаўшы падарункі):* Дабранач, гаспадар з гаспадыняй, дабранач! А не той, што нанач, а той, што на ўвесь век!

*Зычанні (па чарзе):*

***Вучань 5:*** Святкуем калядкі — лавіце зярняткі!

***Вучань 6:*** Майце ўсяго даволі, а бяды — ніколі!

***Вучань 7:*** Здаровы бывайце — нас не забывайце [4, с. 62].

*Гурт адыходзіць.*

Пасля паказу можна арганізаваць сумесны салодкі стол.

Дзякуючы такой форме у дзяцей фарміруюцца веды аб прыёмах і правілах зносін, кантролі сваіх паводзін і эмацыйнага стану, развіваюцца творчыя здольнасці. Разам з гэтым актывізуюцца і ўдасканальваюцца слоўнікавы запас, граматычны лад маўлення, гукавымаўленне, навыкі звязнага маўлення, выразнасць маўлення, што непасрэдна спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Яшчэ адной формай працы настаўніка па фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі можа быць ***драматызацыя***. Такая форма прадугледжвае стварэнне каляднага гурта і непасрэдна правядзенне калядавання, напрыклад, у сваёй школьнай паралелі. Такая форма пазакласнай працы больш падыходзіць для вучняў IV класа. Неабходна сярод жадаючых выбраць дзейных асоб, раздаць словы для развучвання на памяць і правесці некалькі рэпетыцый. Разгледзім на канкрэтным прыкладзе.

## Драматызацыя абраду калядавання

***Мэта:*** паказаць вучням частку традыцыйнага свята Каляды.

***Задачы:***

- развіваць маўленне і пашыраць слоўнікавы запас вучняў;
- выхоўваць павагу да традыцый беларускага народа;
- развіваць творчыя здольнасці вучняў.

***Абсталяванне і матэрыялы:*** касцюмы для каляднага гурта, цукеркі.

***Галоўныя дзейныя асобы:*** Зорканоша (той, хто носіць Калядную зорку); Павадыр Казы; Каза (пераапрануты ў кажух вучань з маскай Казы на галаве); Механоша (той, хто носіць з сабой мяшок з тканіны для падарункаў); хлопцы, дзяўчаты.

*Уваходзіць гурт калядоўшчыкаў з Казою. Кажуць па чарзе.*

***Зорканоша:*** Дазвольце пагрэцца ў вашай хаце!

***Механоша:*** Ой, моцны мароз на дварэ!

***Павадыр:*** Мы самі ідзём і Казу вядзём.

***Вучань 1:*** Дзе Каза бывае, там шчасце чакае, а дзе не бывае, там яно мінае!

***Вучань 2:*** Дзе Каза нагою, там жыта капою, а дзе Каза рогам — там жыта стогам!

***Вучань 3:*** Ну-тка, Козанька, расхадзіся, па ўсяму двару разыйдзіся!

*Каза скача пад песню «Го-го-го, каза, го-го-го, шэра» і падае на падлогу.*

***Павадыр:*** Што ж гэта стала, мая Каза ўпала, ссохла, прапала!

***Вучань 4:*** Што ж нам рабіць? Мусіць, трэба Казу пакарміць!

***Вучань 5:*** Ты, Каза, устань, развесяліся ды расхадзіся [5, с. 175].

***Вучань 6:*** Гаспадар ідзе, рэшата нясе, рэшата аўса, паверх каўбаса, тры кускі сала, каб Каза ўстала!

***Механоша:*** Нашай Козаньцы нямнога трэба: два боханы хлеба, сем печ перапеч!

***Вучань 1:*** А яшчэ аладкі, каб бокі гладкі!

***Вучань 2:*** Яшчэ таго мала: дайце кусок сала, чацвёрты пірог, каб Казу сцярог!

*Адначасова збіраюць падарункі.*

***Зорканоша:*** А хто харошы, хай насыпле грошы!

***Вучань 3:*** Каза наша вучоная — кіем хрышчоная, прайшла ўсе навукі, ведае розныя штукі!

***Вучань 4:*** А ну, закладай рогі ды падбірай ногі, з хаты выхадзі, бяду вынасі!

*Каза ўстае і скача.*

*Зычанні (па чарзе):*

***Вучань 5:*** Лавіце рукой, каб добры быў настрой!

***Вучань 6:*** Нікога не хвалюйце — усім цяпло даруйце [4, с. 62].

*Калядоўшчыкі адыходзяць.*

Такая форма пазакласнага мерапрыемства развівае пачуццё калектывізму, адказнасці адзін за аднаго, фарміруе вопыт паводзін і вопыт зносін, стымулюе развіццё творчай актыўнасці.

Мы паказалі прыклады фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў пазакласнай дзейнасці малодшых школьнікаў у працэсе сюжэтна-ролевай гульні на матэрыяле традыцыйнага свята Каляды. У час такой дзейнасці вучні пераймаюць адзін у аднаго існуючыя веды, адбываецца працэс стымулявання маўленчых зносін.

Такім чынам, фальклор нясе ў сабе патэнцыял для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў. Прастата, лакавічнасць, эмацыянальнасць, выразнасць фальклорнага матэрыялу зразумелая для малодшых школьнікаў. Фальклор развівае мову і маўленне дзяцей, фарміруе вопыт зносін, спрыяе ўзаемадзеянню дзіцяці з дарослымі і з аднагодкамі, аб'ядноўвае дзіцячы калектыў. Акрамя таго, сучасныя дзеці праяўляюць цікавасць да фальклорных твораў, што можа стаць адным са шляхоў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания : 4 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 203 с.
2. *Быстрова, Е. А.* Обучение русскому языку в школе : учеб. пособие для студентов педагогических вузов / Е. А. Быстрова, С. И. Львова, В. И. Капинос и др. ; под ред. Е. А. Быстровой. — 2-е изд., стер. — М. : Дрофа, 2007. — 237 с.
3. *Сяменьчык, Я.* Беларускія святы : Каляды [Электронны рэсурс] / Бібліятэка гістарычных артыкулаў «Жыве Беларусь». — Рэжым доступа: http://www.jivebelarus.net. — Дата доступа: 09.12.2008.
4. На нова лета... : метадычныя распрацоўкі настаўнікаў этнашколы ў Сеніцы. — Мінск : Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, 2003. — 128 с.
5. *Ліцьвінка, В. Д.* Святы і абрады беларусаў / В. Д. Ліцьвінка. — 3-е выд. — Мінск : Беларусь, 2001. — 190 с. : іл.